– набыццё ўменя рацыянальна арганізоўваць заняткі, самастойна засвойваць вучэбны матэрыял, фарміраваць асабісты рэпертуар;

– развіццё ўстойлівай базы навыкаў і ўменняў для вырашэння шырокага дыяпазону мастацкіх і тэхналагічных праблем, узнікаючых у працэсе творчай і педагагічнай дзейнасці.

Для ўдасканалення выканальніцкага мастацтва вучэбны рэпертуар павінен уключаць творы розных стыляў і напрамкаў акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі. Таксама кожны студэнт павінен вывучаць музычныя творы розных жанраў і форм, паліфанію.

Базай для спасціжэння тэхнічнай дасканаласці павінна з’яўляцца работа над інструктыўным матэрыялам (практыкаванні, гамы, эцюды). Пры выбары інструктыўнага матэрыялу належыць улічваць не толькі іх тэхнічнае прызначэнне, але і мастацкую значнасць. Вывучэнне эцюдаў можа прымаць розныя формы ў залежнасці ад характару вучэбных задач, напрыклад: выкарыстоўванне іх у плане азнаямлення, чытання нот з ліста, або непасрэдна канцэртнага выканання. Развіццю выканальніцкага майстэрства значна садзейнічае работа па набыццю навыкаў чытання з ліста, а таксама ансамблевага выканальніцтва.

Выканальніцкая практыка студэнта павінна ажыццяўляцца пастаянна і ўключаць у сябе не толькі залікі і экзамены, а таксама адкрытыя канцэрты.

Выкладанне дысцыпліны “Спецінструмент (віяланчэль)” грунтуецца на непарыўнай сувязі тэорыі з практыкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працэс падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне мастацтва эстрады накіраваны на авалоданне студэнтамі *ведамі і ўменнямі,* якія дазволяць на высокім узроўні вырашаць прафесійныя задачы ў далейшай творчай і педагагічнай дзейнасці.

Выпускнік павінен *ведаць:*

– акустычныя і мастацкія магчымасці інструмента;

– прынцыпы і метады прафесійнага авалодвання выканальніцкай тэхнікай;

– прыкладныя аспекты выканальніцкай тэхнікі;

– метады дасягнення прафесійных задач;

– мастацка-вобразныя аспекты выканання твора;

– жанры, формы і стылі акадэмічнай, джазавай, рок- і поп-музыкі;

– прынцыпы самастойнай работы над творам.

Выпускнік павінен*умець:*

– карыстацца акустычнымі і мастацкімі магчымасцямі інструмента;

– прафесійна валодаць выканальніцкай тэхнікай;

– арыентавацца ў стылявых напрамках сучаснай музычнай культуры і выконваць на прафесійным узроўні сольную праграму з твораў беларускіх, рускіх, заходнееўрапейскіх і амерыканскіх кампазітараў розных жанраў, формаў і стыляў;

– самастойна працаваць над творам у працэсе стварэння выканальніцкай інтэрпрэтацыі;

– чытаць ноты з ліста і транспанаваць твор у розныя танальнасці.

Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі навучання), якія адказваюць мэтам вывучэння дадзенай дысцыпліны, з'яўляецца: метад праектаў, метад творчых майстэрняў, брыгадны метад, метад аналізу пэўных сітуацый, праблемны метад.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Спецінструмент (віяланчэль)” адведзена ўсяго 730 г., з якіх 310 г. аўдыторныя (індывідуальныя) заняткі. Веды і практычныя навыкі студэнтаў рэкамендуецца кантраляваць у працэсе навучання ў форме залікаў і экзаменаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелыі тэмы | Колькасць аўдыторных (індывідуальных) гадзін |
|---|---|
| **РАЗДЗЕЛ I. Агульныя элементы музычнага выканальніцтва** | |
| *Уводзіны.* | **2** |
| Тэма1.*Агульная і індывідуальная пастаноўка тэхнічнага апарату музыканта.* | 8 |
| Тэма2. *Метрі рытм як элементы музычнага выканальніцтва.* | 8 |
| Тэма 3. *Дынаміка, тэмбр.* | 6 |
| Тэма4. *Фразіроўка.* | 6 |
| Тэма5. *Музычны сінтаксіс. Мелодыя.* | 12 |
| **Раздзел II. Музыкальна-выканальніцкая тэхніка** | |
| Тэма 1. *Гуказдабыванне.* | 18 |
| Тэма2. *Інтанацыя.* | 14 |
| Тэма3. *Вібрацыя як сродак музычнай выразнасці.* | 12 |
| Тэма 4. *Штрыхі: артыкуляцыя штрыхоў, размеркаванне смычка.* | 26 |
| Тэма 5. *Аплікатура і яе магчымасці.* | 10 |
| **Раздзел III. Фарміраванне асноў выканальніцкага майстэрства і вучэбны рэпертуар** | |
| Тэма 1. *Інструктыўны матэрыял (практыкаванні, гамы, эцюды.)* | 20 |
| Тэма 2.*Вывучэнне твораў малой формы.* | 48 |
| Тэма 3. *Вывучэнне твораў буйнай формы.* | 58 |
| Тэма 4. *Асаблівасці выканання: каноны музычных стыляў і жанраў.* | 8 |
| Тэма 5. *Тэхніка чытання нот з ліста* | 8 |
| Тэма 6.*Падрыхтоўка да эстраднагавыступлення.* | 8 |
| **Раздзел IV. Сучаснае музычнае мастацтва** | |
| Тэма 1. *Складаючыя джазавай мелодыкі. Ладавая аснова.* | 14 |
| Тэма 2. *Сучасныя рытмічныя мадэлі.* | 14 |
| **Раздзел VI. Навыкіансамблевага выканальніцтва** | 10 |
| **Усяго** | **310** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*Уводзіны.*

Задачы і мэты дысцыпліны. Састаўленне індывідуальных планаў для кожнага студэнта. Паслядоўнасць у выбары рэпертуару. Неабходнасць уключэння ў рэпертуар розных па змесце, форме і стылю твораў замежнай, рускай і беларускай музыкі. Развіццё ініцыятыўнасці, гнуткасці музыкальнага мыслення студэнтаў. Развіццё выканання кожнага музычнага твора на дастаткова высокім мастацкім узроўні, з пэўнай ступенню тэхнічнай дасканаласці, без скідак на няспеласць выканаўцы ці цяжкасць твора.

## РАЗДЗЕЛ I. Агульныя элементы музычнага выканальніцтва

*Тэма 1. Агульная і індывідуальная пастаноўка тэхнічнага апарату музыканта*

Пастаноўка на інструменце: максімальная фізічная свабода, якая забяспечвае неабмежаваныя тэхнічныя магчымасці выканаўца, хуткасць рэакцыі, палёт фантазіі. Фізіялагічны камфорт, зручнасць пры выкананні музычнага твора і выкарыстанне шматлікіх тэхнічных сродкаў і прыёмаў ў кароткі прамежак часу без папярэдняй падрыхтоўкі. Варыянты пастаноўкі левай рукі. Ігра смычком і піцыката. Універсальнасць валодання смычком. Размеркаванне смычка, залежнасць размеркавання ад мастацкай задумы выканаўца.

*Тэма 2. Метрі рытм як элементы музычнага выканальніцтва*

Рытм галоўны элемент музычнага выканальніцтва. Паняцце метрарытму, валоданне ведамі як складаюцца рытмічныя малюнкі, асаблівасці іх выканання. У залежнасці ад эпохі, стылю - аднолькавыя рытмічныя малюнкі выконваюцца па рознаму. Абавязкова дакладна выконваць рытмічны малюнак. Суадносіны метрарытму і рытма. Выразны рытм – патрабаванні сольнага выканаўства.

*Тэма 3. Дынаміка, тэмбр*

Валоданне дынамікай ад “pp” да “ff”. Крэшчэнда, дымінуэнда. Сфарцанда, “fp”. Дынаміка музычнага твора залежыць так сама ад стылю і можа быць рэльефнай, тэраснай і графічнай. Выкарыстанне інтанацыйных эфектаў для агучвання дынамічных ліній, для гарманічнай выразнасці. Тэмбр інструмента залежыць ад прыгажосці гуку, ад дакладнага інтанавання.

*Тэма 4. Фразіроўка*

Мелодыя, яе вядучае значэнне ў музычным творы,работа над ёй. Значэнне аналізу структуры музычнай фразы для правільнага чытаннянотнага тэксту і раскрыцця зместу музычнагатвора. Вызначэнне музычных фраз пры выка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нанні музычных твораў. Мастацкія сродкі фразіроўкі. Абавязковае захаванне аўтарскіх указанняў у нотным тэксце як адна з асноў мастацтва інтэрпрэтацыі. Неразрыўная сувязь розных музычных знакаў з музычнай думкай – фразай.

*Тэма 5. Музычны сінтаксіс. Мелодыя.*

Агульныя паняцці і азначэнне мелодыі. Высотны і часавы бок мелодыі. Жанравыя якасці мелодыі. Паняцце “меладычная лінія” і “меладычны малюнак”, “музычная думка” і “музычны вобраз”. Інтанацыйная прырода ў музыцы. Тыпы інтанацый: эмацыянальнага складу (лірычныя, эпічныя, танцавальныя); музычна-паэтычнага сінтэзу (мелодыі, пранізаныя рытмаінтанацыямі, што адлюстроўваюць рысы музычнага жанру); мелодыі з перавагай распеўных музычна-моўных інтанацый. Агульнае паняцце аб музычным сінтаксісе. Характарыстыка перыяда. Значэнне закона метрычнай квадратнасці ў вызначэнні памеру перыяду і яго ўнутранай структуры.

## *Раздзел ІІ.* **Музыкальна-выканальніцкая тэхніка**

*Тэма 1. Гуказдабыванне*

Вядзенне смычка, правільны напрамак смычка, вугал вядзення смычка. Валоданне выпрацоўкай і размеркаваннем веса смычка ў залежнасці ад дынамікі і характару музычнага твора. Змены смычка, струн. Філіраванне гуку. Прыгажосць гуку. Пошук тэмбру інструмента ад дакладнага інтанавання.

*Тэма 2. Інтанацыя*

Інтанаванне на інструменце – пастаяннае развіццё слыху. Абсалютная дакладнасць інтанавання характарызуе пэўны выканальніцкі прыём. Імкнуцца не адхіляцца ад дакладнай інтанацыі ў кожнай ноце. Інтанаванне сярод групай нот.

*Тэма 3. Вібрацыя як сродак музычнай выразнасці*

Вібрацыя – выканальніцкі навык, мастацкі элемент ігры на інструменце. Уплыў вібрацыі на тэмбр, сілу і якасцьгуку. Сувязь вібрацыі з эмацыянальнасцю выканання, тэмбрам і дынамікай гучання. Адпаведнасць характару вібрацыі зместу і стылю выконваемага музычнага твора. Тэмп і амплітуда вібрацыі, залежнасць ад розных выканальніцкіх задач. Віды вібрацыі: локцевая, кісцевая, змешаная. Асноўныя метады вывучэння вібрацыі. Амплітуда, частата, форма руху ў розных рэгістрах, пазіцыях. Значэнне свабоды і эластычнасці пальцаў левай рукі для развіцця вібрацыі.

*Тэма 4. Штрыхі: артыкуляцыя штрыхоў,*
*размеркаванне смычка.*

Паняцце штрыха. Разнастайнасці штрыхоў. Абазначэнне штрыхоў у нотнай запісы. Залежнасць жадаемага гучання ад правільнасці выканання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

штрыхоў. Штрыхавыя магчымасці. Выкарыстанне штрыхоў у розных стылях, кірунках. Неабходнасць набыцця навыку правільнага выбару штрыхоў для кожнага стылю. Спецыфіка выканання пункцірных і камбінаваных штрыхоў. Класіфікацыя штрыхоў: ляжачыя, прыгучыя і рыкашэт. Дакладная характарыстыка штрыхоў (дэташэ, легата, стаката. спіката, саціе, мартэле) і іх злучэнняў. Засваенне найбольш важных прыёмаў гукавядзення: легата, дэташэ, марката, стаката, спіката. Выкананне ў розных тэмпах з агагічнымі зменамі. Паступовае, працяглае паскарэнне тэмпу і запавольванне яго. Рух смычка, змяненне руху у залежнасці ад змянення характару музыкі, дынамікі. Якасць гуку як вынік правільнага музычна-слыхавога ўяўлення і мэтазгоднай работы ўсіх частак правай рукі пры пастаянным слыхавым кантролі. Сродкі музычнай выразнасці. Уздзеянне смычка на струну, дасягненне натуральнасці гуку. Роля пастаноўкі і рухаў правай рукі пры гуказдабыванні, адчуванне вагі рукі як асновы гуказдабывання. Мышцы пляча – крыніца сілы. Роля перадплечча, кісці і пальцаў рукі ў карэкціроўцы рухаў смычка. Схема рухаў частак правай рукі пры вядзенні смычка. Асноўныя віды штрыхоў і іх значэнне як сродкаў музычна-мастацкай выразнасці. Тэхніка плаўных штрыхоў: дэташэ, легата; прынцыпы мастацкага выкарыстоўвання гэтых штрыхоў. Адрывістыя штрыхі: мартэле, стаката, тэхніка іх выканання. Прыгаючыя штрыхі: спіката, сацiе, лятучае стаката, рыкашэт. Змешаныя штрыхі. Дэкламацыйна-выразная сутнасць штрыхоў.

*Тэма 5. Аплікатура і яе магчымасці*

Абсалютнае веданне грыфа, навыкі міжпазіцыйнай ігры. Свабоднае арыентаванне ва ўсіх танальнасцях у храматычнай паслядоўнасці. Адпаведнасць пастаноўкі кожнага пальца пэўнай ноце. Выпрацоўка рэфлексорнага ўспрымання гуку. Універсальнае размяшчэнне пальцаў на грыфе, што дазваляе без папярэдняй падрыхтоўкі выкананне максімальна магчымай колькасці гукаў. Аплікатурнае бачанне меладычнага матэрыялу. Развіццё навыкаў успрымання музычнай думкі як пэўнай камбінацыі пальцаў. Мысленне аплікатурнымі стандартамі, трэнінг на аўтаматызм выканання аплікатурных структур.

## Раздзел ІІІ. Фарміраванне асноў выканальніцкага майстэрства і вучэбны рэпертуар

*Тэма1. Інструктыўны матэрыял (практыкаванні, гамы, эцюды.)*

Работа над гамамі (арпеджыа, двайныя ноты), практыкаваннямі, эцюдамі – важнае звяно ў вучэбным працэсе. Спалучэнне іх мастацкай значнасці з мэтазгоднасцю вывучэння для развіцця тых або іншых выканальніцкіх навыкаў. У першую чаргу звярнуць увагу на атаку гуку, ён патрэбен быць як уверх смычком так і ўніз аднолькавым. Розныя формы вывучэння эцюдаў у залежнасці ад зместу і характару вучэбных задач. Ігра ў розных тэмпах, рознымі, камбініраванымі штрыхамі. Развіццё тэхнікі левай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рукі. Развіццё маторыкі, бегласці пальцаў левай рукі. Пераходы з адной пазіцыі ў другую. Давядзенне выканання эцюдаў да магчымай ступені закончанасці і выкарыстанне эцюдаў ў плане азнаямлення ці для чытання нот з ліста.

*Тэма 2. Вывучэнне твораў малой формы*

Малая форма: паліфанія, п’есы (хуткія і павольныя), капрысы. Цяжкасць выканання малой формы залежыць ад малога працягу часу. З первых нот трэба раскрыць сэнс і характар музычнага твора. Вызначэнне музычнай фразіроўкі, кульмінацыі твора. Дакладнае выкананне рытмічнага малюнка. Цэзура як сродак музычнай выразнасці. Філіраванне гуку.

*Тэма 3. Вывучэнне твораў буйной формы*

Да іх датычацца: варыяцыі, санаты (старынная), канцэрты. Правільнасць выканання твораў буйной формы залежыць ад шэрагу фактараў: стыль, эпоха, індывідуальны стыль кампазітара, адзінства формы, метрарытму, дынамічнага і рытмічнага адзінства, адзінства і разнастайнасць частак. Аплікатура, дынаміка, штрыхі, рытм, гук, музычна-мастацкая выразнасць. Асэнсанаванне стылістыкі і формаўтвараючыя фактары, змест мастацкага вобраза і прыёмы выразнай артыкуляцыі.

*Тэма 4. Асаблівасці выканання:*
*каноны музычных стыляў і жанраў.*

Агульныя прынцыпы музычнай эстэтыкі, іх прымяненне да інтэрпрэтацыі музычных твораў. Асаблівасці выканання музыкі эпох: барока, класіцызму, рамантызму, музыкі сучасных, беларускіх кампазітараў. Вывучэнне манеры пісьма,асаблівасцей формы, фактуры музычнага твора, ягопрыналежнасціда таго або іншага жанру. Узнаўленне ў выканаўстве характэрныхрысаў музычнагастылю. Мнагазначнасць паняцця “музычныстыль”. Нацыянальны каларыт. Спасціжэнне сутнасці самых розныхмастацкіх напрамкаў, набыццёўмення передаваць іх характэрныяасаблівасці. Неабходнасць навучання ігры ў розныхжанрах. Роля інтуіцыі ў выканальніцкімпрацэсе.

*Тэма 5. Тэхніка чытання нот з ліста.*

Чытанне нот з ліста як фактар, што развівае выканальніцкія навыкі. Умова паступовага ўскладнення чытаемага нотнага матэрыялу. Прынцыпы чыткі і іх значэнне для прафесійнага станаўлення музыканта.

*Тэма 6. Падрыхтоўка да эстраднагавыступлення.*

Зразумеласцьмастацкага зместу і мэты як неабходнаяўмова падрыхтоўкі да эстраднагавыступлення. Асаблівасці псіхалагічнага і фізіялагічнага стану на эстрадзе. Эстраднае і перадэстраднае хваляванне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэжым."Эстрадны тонус". Формы праяўлення хвалявання і метады яго пераадолення. Канцэнтрацыя творчай увагі на змесце і характары твора – сродак барацьбы з эстрадным хваляваннем.

## Раздзел IV. Сучаснае музычнае мастацтва.

*Тэма 1. Складаючыя джазавай мелодыкі. Ладавая аснова.*

Гамападобныя рухі, арпеджыа. Важнасць мелодыі ў джазе. Джазавую мелодыку характарызуе манера гуказдабывання, атаку гука, акцэнтаванне долей, артыкуляцыя, "свінг". Імправізацыйная лінія ўключае гамападобныя пабудовы. Абпяванні. Храматызмы. Разуменне значнасці ведаў гармоніі. Альтэрацыя гукаў. Сэптакорды, нонакорды. Лады: лідзійскі, эалійскі, міксалідзійскі, дарыйскі, іянійскі і інш. Абазначэнне акордаў. Выкарыстанне для гэтых мэт літар, лічбаў, рымскіх лічбаў, арабскіх лічбаў і выкарыстанне знакаў "+", "-".

*Тэма 2 . Сучасныя рытмічныя мадэлі*

Выкананне джазавай музыкі звязана з прысутнасцю асобага рытмічнага пачуцця, называемага свінгам. Свінг характарызуецца дадатковай энергіяй, дынамічным пад'ёмам, рухам на перад. "Блукаючыя акцэнты" – акцэнтаванне асобных нот. Сінкопы. Метрычныя суадносіны. Асаблівасці выканання блюза значацца ў мінорнай пентатоніцы. Прынцып слізгання. Блюзавыя стандарты.

## Раздзел VI. Навыкі ансамблевага выканальніцтва

Творчая дысцыпліна, слыхавы самакантроль, узаемаразуменне, уменне слухаць і трактаваць сваю партыю як частку цэласнага музычнага вобраза – прынцыпы ансамблевага выканаўства. Адзінства тэмпу, штрыхоў, дынамікі, суадносін галасоў, чыткі з ліста, раскрыцця ідэйна-мастацкай задумы выконваемага твора. Прынцып паступовасці і паслядоўнасці навучання ансамблеваму выканаўству.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# *ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА*

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Беккер, Х.*, *Ринар, Д.* Техника и искусство игры на виолончели Х. Беккер, Д. Ринар Д. – Л.: Музгиз, 1978. – 220 с.
2. *Броун, А.В.* Очерки по методике игры на виолончели / А.В. Броун. – М.: Музыка, 1960. – 112 с.
3. *Гинзбург, Л.С.* О работе над музыкальным произведением / Л.С. Гинзбург. – М.: Музыка, 1981. – 73 – 84 с.
4. *Давыдов, К.Ю.* Школа игры на виолончели / К.Ю. Давыдов. – М.: Музыка, 1988. – 125 с.
5. *Капилов, А.* Скрипка белорусская / А.Л.Капилов. – Мн.: Беларусь, 1982. – 92 с.
6. *Кэмбел, Д.* Эффект Моцарта / Д. Кэмбел. – Минск: Попури, - 1999. – 320 с.
7. *Мордеровский, Л.Н;* Школа игры на виолончели/ Л.Н. Мордеровский. – Л.: Музгиз, 1974. – 260 с.
8. *Панасье, Ю.* История подлинного джаза / Ю. Панасье. – Л.: Музгиз, 1980. – 320 с.
9. *Сапожников, А.Н.* Школа игры на виолончели / А.Н. Сапожников. – М.: Музыка, 1982. – 87 с.
10. *Сахарова, В.В.* Художественная интерпретация музыкального произведения в контексте исполнительского искусства / В.В. Сахарова. – Научные труды Бел.гос. академии музыки, вып.14, 2007. – 49-62с.
11. *Сергиенко, Р.А.* Исполнительская интерпретация музыкального произведения / Р.И. Сергиенко. – Мн.: Беларусская академия музыки, 1992. – 23 – 29 с.
12. *Струве, Б.Я.* Вибрация как исполнительский навык игры на смычковых инструментах / Б.Струве. – Л.: Музыка, 1983. – 85 с.
13. *Щербаков, Н.С.* Жизнь в музыке А.П. Стогорского / Н.С. Щербаков. – Мн.: БелДИПК, 2002. – 170 с.
14. *Янкелевич, Ю.* Педагогическое наследие / Ю.Янкелевич. – М.: Музыка, 1986. – 317 с.
15. *Яншинов, А.С.* Техника смычка / А.С. Яншинов. – М.: Музыка, 1933. – 41 – 64 с.


*Дадатковая*


1. *Гинзбург, Л.С.* К.Ю. Давыдов / Л.С. Гинзбург. – Л.: Музгиз, 1968. – 111 – 202 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Казальс, П.* Автобиография / П. Казальс. – М.: Советский композитор, 1976. – 340 с.
3. *Козолупова, Г.С.* С.М. Козолупов / Г.С. Козолупова. – М.: Музыка, 1974. – 420 с.
4. *Нейгауз, Г.* Об искусстве фортепьянной игры / М.: Музыка, 1969. – 320 с.
5. *Ширинский, А.* Штриховая техника скрипача / Л.: Музгиз, 1979. – 56 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў*

Пры складанні заданняў самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Спецінструмент (віяланчэль)» неабходна прадугледзець узрастанне іх складанасці: ад заданняў, якія фарміруюць дастатковыя веды па вывучаным вучэбным матэрыяле на ўзроўні пазнавання, да заданняў, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні ўзнаўлення, і далей да заданняў, якія фарміруюць кампетэнцыі на ўзроўні ўжывання атрыманых ведаў.

Пры выкананні самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне «Спецінструмент (віяланчэль)» студэнт павінен звярнуць увагу на:

– самастойныя заняткі на інструменце;

– праслухоўванне аўдыязапісаў майстроў акадэмічнай і сучаснай музыкі;

– прагляд відэаматэрыялаў адкрытых заняткаў знакамітых педагогаў;

– наведванне майстар-класаў вядучых педагогаў краіны і іншых краін;

– вывучэнне тэарэтычнай часткі спадчыны знакамітых педагогаў.

## *Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў*

- тэматыка адкрытых урокаў;
- тэставыя заданні;
- тыпавыя заданні;
- тэсты па асобным тэмам;
- вуснае апытанне ў час заняткаў;
- выступленне студэнтаў у тэматычных канцэртах;
- экзамен;
- дзяржаўны экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*1(адзін)* Адмова ад выканання праграмы, адсутнасць прырашчэння ведаў і кампетэнтнасці ў рамках адукацыйнага стандарту.

*2(два)* Фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту; веды асобных музычна-выканальніцкіх крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай дысцыпліны; няўменне выкарыстаць музычную тэрміналогію дысцыпліны; наяўнасць ў выкананні праграмы грубых і лагічных памылак; пасіўнасць на занятках, нізкі ўзровень культуры выканання музычных твораў.

*3(тры)* Нядосыць поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту; выкананне музычных твораў з істотнымі і лагічнымі памылкамі; слабае валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў, пасіўнасць на занятках, нізкі ўзровень музычнай культуры выканання ігры на інструменце.

*4(чатыры)* Дастатковы аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту; засваенне асноўнай музычнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; лагічнае выкананне музычнай праграмы, без істотных памылак; валоданне агульнымі элементамі музычнага выканаўства на інструменце; валоданне музыкальна-выканальніцкай тэхнікай ігры на інструменце; не дакладнае інтанаванне, гуказдабыванне, вібрацыя, размеркаванне смычка; дапушчальны ўзровень выканальніцкай культуры ігры на інструменце.

*5(пяць)* Дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; валоданне агульнымі элементамі музычнага выканаўства на струнных інструментах; лагічнае мысленне музычнай формы; выкарыстоўванне шматлікіх тэхнічных сродкаў і прыёмаў; выкарыстанне ўніверсальных смычковых прёмаў; не дастатковая гнуткасць музычнага мыслення; не дакладнае інтанаванне, гуказдабыванне, вібрацыя, размеркаванне смычка; добры ўзровень выканальніцкай музычнай культуры ігры на інструменце.

*6(шэсць)* Досыць поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; прысутнасць комплекса музычных здольнасцей (інтанаванне, дакладны рытм, штрыхі, гуказдабыванне, музычнае пачуццё); досыць свабоднае валоданне інструментам, музычнае мысленне, музыкальны густ; здольнасць самастойна ўкараніць тыпавыя рашэнні ў рамках вучэбнай праграмы; не дасканалыя сродкі выразнасці рэалізацыі мастацкай задумы аўтара.

*7(сем)* Сістэматызаваныя, глыбокія і поўная веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ігры на струнных інструментах; наяўнасць комплекса музычных здольнасцей (інтанаванне, дакладны рытм, штрыхі, гуказдабыванне, музычнае пачуццё); свабоднае валоданне музыкальна-выканальніцкай тэхнікай ігры на інструменце; засваенне асноўнай і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дадатковай музычнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмы дысцыпліны; высокі ўзровень музычнай культуры выканання праграмы.

*8(восем)* Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; наяўнасць комплекса музычных здольнасцей (дакладнае інтанаванне, адчуванне рытму, і г.д.); свабоднае валоданне тэхнічнымі сродкамі і штрыхамі ў музычных творах розных стылявых напрамкаў; здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай музычнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмы дысцыпліны; актыўная самастойная праца і сістэматычны ўдзел ў розных канцэртных мерапрыемствах; высокі музычна-мастацкі густ выканання

*9(дзевяць)* Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ігры на інструменце; наяўнасць музычных здольнасцей (дасканалае інтанаванне, артыкуляцыя штрыхоў, рытмічных узораў, баланс гучання, і г.д.); наяўнасць мабілізацыі ўвагі, канцэнтрацыі творчых сіл, сваіх адносін да выканання, інтэрпрэтацыі, адчуванне асноўнага музычнага вобраза, мастацкі густ; актыўная самастойная праца і сістэматычны удзел у канцэртах.

*10(дзесяць)* Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды ў мастацкім музычна-выканальніцкім майстэрстве ігры на інструменце; бездакорнае выкананне праграмы; інтэрпрэтацыя музычнага твора, адчуванне асноўнага музычнага вобраза, мастацкі густ, дасканалае інтанаванне, асэнсаваны рытм, баланс гучання, дынаміка, тэмп; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай музычнай літаратуры ў рамках вучэбнай праграмы; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы пры выкананні музычных твораў; ужыццяўленне спецыфікі ігры на элетраінструментах; удзел у канцэртах, фестывалях, конкурсах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКАЯ КАРТА УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ:

***дневная форма получения образования***

| Разделы и темы | Количество аудиторных часов | | | Форма контроля знаний |
|---|---|---|---|---|
| | всего | Индиви-дуальные | КСР | |
| **Раздел I. Общие элементы музыкального исполнительства** | | | | |
| Введение. | | 2 | | |
| Тема 1. Общая и индивидуальная постановка технического аппарата музыканта. | | 20 | | |
| Тема 2. Метр и ритм как элементы музыкального исполнительства. | | 20 | | |
| Тема 3. Динамика, тембр. | | 10 | | |
| Тема 4. Фразировка. | | 10 | | |
| Тема 5. Музыкальный синтаксис. Мелодия. | | 10 | | |
| **Раздел II. Музыкально-исполнительская техника** | | | | |
| Тема 1. Звукоизвлечение. | | 20 | | |
| Тема 2. Интонация. | | 20 | | |
| Тема 3. Вибрация как средство музыкальной выразительности. | | 10 | | |
| Тема 4. Штрихи: артикуляция штрихи, распределение смычка. | | 10 | | |
| Тема 5. Аппликатура и ее возможности. | | 6 | | |
| **Раздел III. Формирование основ исполнительского мастерства и учебный репертуар** | | | | |
| Тема 1. Инструктивный материал (упражнения, гаммы, этюды.) | | 20 | 10 | Техниче-ский зачет |
| Тема 2. Изучение произведений малой формы. | | 30 | 20 | Академи-ческий концерт |
| Тема 3. Изучение произведений крупной формы. | | 30 | 22 | Экзамен |
| Тема 4. Особенности выполнения: каноны музыкальных стилей и жанров. | | 4 | | |
| Тема 5. Техника чтения нот с листа | | 2 | 4 | Контроль-ный урок |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Тема 6. Подготовка к эстрадному выступлению. | | 2 | | |
| **Раздел IV. Современное музыкальное искусство** | | | | |
| Тема 1. Составляющие джазовой мелодики. Ладовая основа. | | 4 | | |
| Тема 2. Современные ритмические модели. | | 3 | | |
| **Раздел V. Навыки ансамблевогоисполнительства** | | 3 | | |
| **Всего…** | **292** | **236** | **56** | **Зачёт, экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.3 УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКАЯ КАРТА УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ:

***заочная форма получения образования***

| Разделы и темы | Количество аудиторных часов | Форма контроля знаний |
|---|---|---|
| | Индивидуальные занятия | |
| **Раздел I. Общие элементы музыкального исполнительства** | | |
| Введение. | 2 | |
| Тема 1. Общая и индивидуальная постановка технического аппарата музыканта. | 6 | |
| Тема 2. Метр и ритм как элементы музыкального исполнительства. | 2 | |
| Тема 3. Динамика, тембр. | 2 | |
| Тема 4. Фразировка. | 2 | |
| Тема 5. Музыкальный синтаксис. Мелодия. | 2 | |
| **Раздел II. Музыкально-исполнительская техника** | | |
| Тема 1. Звукоизвлечение. | 2 | |
| Тема 2. Интонация. | 2 | |
| Тема 3. Вибрация как средство музыкальной выразительности. | 2 | |
| Тема 4. Штрихи: артикуляция штрихи, распределение смычка. | 4 | |
| Тема 5. Аппликатура и ее возможности. | 2 | |
| **Раздел III. Формирование основ исполнительского мастерства и учебный репертуар** | | |
| Тема 1. Инструктивный материал (упражнения, гаммы, этюды.) | 10 | |
| Тема 2. Изучение произведений малой формы. | 12 | |
| Тема 3. Изучение произведений крупной формы. | 14 | |
| Тема 4. Особенности выполнения: каноны музыкальных стилей и жанров. | 2 | |
| Тема 5. Техника чтения нот с листа | 2 | |
| Тема 6. Подготовка к эстрадному выступлению. | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Раздел IV. Современное музыкальное искусство | | |
|---|---|---|
| Тема 1. Составляющие джазовой мелодики. Ладовая основа. | 2 | |
| Тема 2. Современные ритмические модели. | 2 | |
| **Раздел V. Навыки ансамблевого исполнительства** | 2 | |
| **Всего…** | **68** | **Зачёт, экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4 Основная литература


1. *Белый,А.* Символизм / А. Белый. – М.: Музыка, 1910. – 57 с.
2. *Бэлза, И. Ф.* Исторические судьбы романтизма в музыке / И. Ф. Бэлза.- М.: Музыка, 1985. – 140с.
3. *Гайдамович, Т. А.* Чайковский. Вариации на тему рококо / Т. А. Гайдамович. – М.: Музыка, 1990. – 95 с.
4. *Гайдамович, Т.А.* Портреты виолончелистов / Т.А. Гайдамович. – М.: Энциклопедический биографический словарь. “Русское зарубежье”, 1987. – 320 с.
5. *Гинзбург, Л.* Лекции по истории исполнительского икусства / Л. Гинзбург. – М.: Музыка, 2001. – 235 с.
6. *Гинзбург, Л.* История виолончельного искусства / Л. Гинзбург. – Кн. 1 – 4. М.: Музыка, 1950 – 1976.
7. *Гутор, В. П.* Давыдов как основатель школы виолончельной игры / В. П. Гутор. – М.: Музыка, 1950. – 170 с.
8. *Даниил Шафран.* Виолончельное соло. Сб. статей / Даниил Шафран. – М.: Музыка, 2001.
9. *Лазько, А. В.* Виолончель / А. В, Лазько. – М.: Музыка, 1965. – 210 с.
10. *Мазель, Л. А.* Строение музыкальных произведений / Л. А. Мазель. – М.: Музыка, 1960. – 120 с.
11. *Соколов, А. В.* Введение в музыкальную композицию 20 века / А. В. Соколов. – М.: Музыка, 2004. – 85 с.
12. *Ямпольский, И. М.* Виолончельная техника / И.М. Ямпольский. – М.: Музыка, 1936. – 137 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.5Дополнительная литература


1. *Асафьев, Б. В.* Русская музыка 19 и начала 20 веков / Б. В. Асафьев. – Л.: Музгиз, 1979. – 284 с.
2. *Блок. В.* Концерты для виолончели с оркестром С. Прокофьева / В. Блок. – М.: Музыка, 1959. – 93 с.
3. *Богданова, Т. В.* Виолончельный концерт Шостаковича / Т. В. Богданова. – М.: Музыка, 1960. – 37 с.
4. *Броун, А.В.* Очерки по методике игры на виолончели / А.В. Броун. – 2-е изд. – Москва : Музыка, 1967. – 87 с. : ил., нот. ил.
5. *Витачек, Е. Ф.* Очерки по истории построения смычковых инструментов / Е. Ф. Витачек. Ред. Б. Доброхотов. Изд. 2-е. М.: Музыка. 1964.
6. *Гайдамович*, *Т. А.* Мстислав Ростропович / Т. А. Гайдамович. – М.: Музыка, 1969. – 114 с.
7. *Гайдамович, Т. А.* Сонаты для виолончели и фортепиано Л. Бетховена / Т. А. Гайдамович. – М.: Музыка, 1976. – 168 с.
8. *Григорьев, В. Ю., Гинзбург, Л. С.* История скрипичного искусства / В. Ю. Григорьев, Л. С. Гинзбург. – М.: Музыка, 1990. – 385 с.
9. *Козолупова, Г. С.* С. М. Козолупов. Жизнь и творчество / Г. С. Козолупова. - М.: Музыка, 1986. – 218 с.
10. *Кузнецов, В.* Музыкально-исторические портреты / В. Кузнецов. – М.: Музыка, 1987. – 255 с.
11. *Лазько, А. В.* Виолончельный концерт Дворжака / А. В. Лазько. – М.: Музыка, 1959. – 54 с.
12. *Мадорский, С. А.* Виолончельное творчество Шумана / С. А. Мадорский. – Минск., 1976. – 114 с.
13. *Раабен. Л. Н.* Жизнь замечательных скрипачей и виолончелистов / Л. Н. Раабен. – Л.: Музыка, 1969. – 227 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ